## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

**С.Я. Новікаў**

# КУЗНЯ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

В статье автор продолжает исследование важнейших страниц истории МГПИИЯ периода 70–80-х гг. прошлого века, когда многие достижения в дальнейшем развитии высшего учебного заведения были прочно связаны с именем его третьего ректора – Нины Георгиевны Красновой. Благодаря ее особым усилиям по организации коллектива на решение задач в связи с обеспечением перехода ко всеобщему среднему образованию, удалось не только поднять на новый уровень учебно-воспитательную работу, придать особую динамику развитию НИР, но и превратить Минский иняз в бренд лингвистического образования Советской страны. Среди важнейших достижений того периода – открытие в институте советов по защите диссертаций и начало активной подготовки специалистов высшей квалификации, без которых трудно представить преподавательский корпус МГЛУ и других вузов страны в начале XXI века.

Гісторыя Мінскага іняза з канца лістапада 1970 г. да сярэдзіны красавіка 1990 г. была трывала звязана з дзейнасцю трэцяга рэктара – Н.Г. Красновай, якая на момант прызначэння на гэту адказную пасаду валодала каштоўным вопытам адміністрацыйнай работы, арганізацыі і кіравання вялікімі калектывамі, паколькі на працягу звыш 15 гадоў працавала на розных пасадах у ЦК ЛКСМБ і ЦК КП Беларусі [1, арк. 3, 12, 48; 2, с. 185].

Дзейнасць Н.Г. Красновай* на пасадзе рэктара МДПІЗМ паказвае, што на працягу 1970-х–1980-х гадоў у інстытуце быў сфарміраваны той штатны патэнцыял, які і ў цяперашні час вылучае МДЛУ ў рэйтынгу ВНУ як лепшы праз яго навуковыя і педагагічныя кадры. У тыя гады інстытут пераўтварыўся ў сапраўдную кузню лінгвістычных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Аналіз вучэбнай, навуковай і ідэйна-выхаваўчай работы інстытута за той перыяд, у тым ліку колькасных і якасных зменаў дзейнасці студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага складу, дае падставы для важнай высновы аб асобым значэнні не толькі падбору кадравага складу, актывізацыі іх навукова-педагагічнай дзейнасці, але і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў па прынцыпу адзінства педагагічнага і навуковага працэсу і ідэі максімальнага аб’яднання гэтых напрамкаў дзейнасці на ўсіх узроўнях дзейнасці інстытута.

У адпаведнасці з загадам міністра вышэйшай і сярэдняй адукацыі Беларускай ССР № 513-К ад 24 лістапада 1970 г. кандыдат гістарычных навук Н.Г. Краснова прызначана рэктарам Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў [1, арк. 2]. З першых дзён працы ў інстытуце

* У сувязі з абмежаванасцю памеру артыкула біяграфічныя звесткі пра Н.Г. Краснову апушчаны (гл.: Новікаў С.Я. Краснова Ніна Георгіеўна (да юбілею) / С.Я. Новікаў // Вестник МГЛУ. Сер. 3. – 2008. – № 7. – С. 185–187. Ён жа. Краснова Ніна Георгіеўна (памяці вучонага) / С.Я. Новікаў // Вестник МГЛУ. Сер. 3. – 2013. – № 12. – С. 246–249.

яна актыўна займалася пытаннямі па ўмацаванні яго матэрыяльна-тэхнічнай базы; пад пільнай увагай новага кіраўніка праходзіць будаўніцтва спартыўнага комплексу і актавай залы інстытута, 13-павярховага студэнцкага інтэрнату, дызайнерскае афармленне вестыбюляў інстытута, увядзенне ў эксплуатацыю лабараторый, правядзенне мадэрнізацыі кінапраектнага комплексу, мантаж кнігапад'ёмніка па дастаўцы кніг з кнігасховішча і інш. [1, арк. 23]. Сярод асабліва важных задач, якія паўсталі перад кіраўніцтвам інстытута ў пачатку 1980-х гадоў, значыліся будаўніцтва студэнцкай сталовай на 450 месцаў, рэканструкцыя студэнцкага інтэрната № 1 па Омскім завулку (цяпер вуліца Румянцава. – С.Н.) пад вучэбны корпус з надбудовай 5-га паверха і ўсталяваннем перахода з карпусам «А» і інш. [3, арк. 102].

У 1971 г. быў уведзены ў строй спартыўны комплекс інстытута: тры спартыўныя залы і манеж, а таксама актавая зала на 800 чалавек, памяшканне для факультэта грамадскіх прафесій, і пачалося будаўніцтва шматпавярховага студэнцкага інтэрната на 1180 месцаў. Інстытут набыў навейшыя тэхнічныя сродкі для правядзення вучэбнага працэсу; для заняткаў па фанетыцы з'явіліся кабінеты з чэхаславацкім і японскім абсталяваннем. Атрымана французская спецыяльная аўдыёвізуальная ўстаноўка фірмы «Цыдамель», створана лекцыйная аўтаматазываная аўдыторыя з 11 сістэмамі кіравання. Інстытут набыў вылічальную машыну ЕС 1020. ЭВМ шырока выкарыстоўвалася кафедрай стуктурна-прыкладной і матэматычнай лінгвістыкі ў вучэбнай і навуковай рабоце [4, с. 83].

Асноўную ўвагу рэктар з першых дзён дзейнасці надавала стварэнню неабходных умоў для арганізацыі вучэбнага працэсу. У 1970/71 навучальным годзе інстытут перайшоў на новы вучэбны план, паводле якога былі праведзены змены па спецыяльных дысцыплінах з пункту гледжання размежавання практычнага вывучэння мовы і тэорыі мовы. Сярод дысцыплін асаблівае значэнне надавалася практычнай фанетыцы і практычнай граматыцы, на якія адводзілася звыш 2500 гадзін. Гэта давала магчымасць студэнту авалодаць практычнымі навыкамі па замежнай мове. На вывучэнне другой замежнай мовы адводзілася 770 гадзін. Акрамя таго, студэнты вывучалі методыку выкладання замежных моў, гісторыю мовы, тэарэтычную фанетыку і тэарэтычную граматыку, лексікалогію, гісторыю літаратуры краіны вывучаемай мовы, краіназнаўства, латынь, уводзіны ў мовазнаўства, стылістыку, тэорыю і практыку перакладу, параўнаўчую тыпалогію роднай і замежнай моў і шэраг іншых дысцыплін, тым больш, што выкладаўся спецыяльны цыкл дысцыплін па педагогіцы і псіхалогіі, грамадска-палітычных дысцыплінах, беларускай і рускай мовах, літаратуры. Выпускнікі інстытута атрымлівалі ўсебаковаю гуманітарную адукацыю [4, с. 83].

Ва ўмовах пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ў СССР значна ўзраслі патрабаванні да падрыхтоўкі настаўнікаў замежных моў, абумоўленыя перспектывамі развіцця народнай адукацыі на аснове рашэнняў XXIV з'езда КПСС. У гэтай сувязі кіраўніцтвам інстытута ў канцы 1972 г. былі падрыхтаваны прапановы па асноўных напрамках падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй – настаўнікаў замежных моў, замацаваныя ў плане развіцця МДПІЗМ да 1990 года. Галоўнай задачай заставалася

рацыяналізацыя і інтэнсіфікацыя спосабаў навучання замежным мовам на аснове ўліку навейшых дасягненняў дыдактыкі, лінгвістыкі, псіхалогіі, кібернетыкі, методыкі і шырокага ўкаранення і эфектыўнага прымянення тэхнічных сродкаў і праграмнага навучання, распрацоўкі новых, эфектыўных метадаў навучання, якія развіваюць інтэлект і творчыя здольнасці студэнтаў, дазваляюць ім хутка адаптавацца да канкрэтных умоў навучання [5, арк. 4].

Адпаведна перспектыўнаму плану ў інстытуце прадугледжвалася развіццё навуковых даследаванняў, тэматыка якіх трывала звязвалася з навуковай, вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю калектыву інстытута: у першую чаргу ў вобласці выкарыстання тэхнічных сродкаў у навучанні замежным мовам; далейшай распрацоўкі пытанняў эксперыментальнага вывучэння; правядзення комплексных даследаванняў па актуальных пытаннях тэарэтычнай і эксперыментальнай фанетыкі раманскіх і германскіх моў у іх суадносінах з пытаннямі фанетыкі славянскіх моў (рускай і беларускай) і інш. [5, арк. 8].

Вырашэнне асноўных задач у рамках распрацаванага перспектыўнага плана развіцця інстытута пачалося з вырашэння пытанняў па кадравым забеспячэнні кафедраў высокакваліфікаванымі спецыялістамі і вучэбна-успамагальным персаналам, які меў дастатковы стаж і вопыт работы ў ВНУ. Назіраўся паступовы і даволі істотны рост выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі дактароў навук, прафесараў, кандыдатаў навук і дацэнтаў. У канцы 70-х гг. з агульнай колькасці 543 штатных выкладчыкаў навуковыя ступені і званні мелі 186, ці 34,4 % ад агульнай колькасці асоб прафесарска-выкладчыцкага складу, у тым ліку 1,5 % – дактароў і прафесараў. На пасадах дэканаў 85,5 % кандыдаты і дацэнты, прычым усе кіраўнікі факультэтаў былі ва ўзросце да 60 гадоў; сярод загадчыкаў кафедрамі са званнямі і ступенямі, у тым ліку дактароў навук, прафесараў, былі 91,4 %, усе да 60 гадоў. Па факультэтах гэты паказчык выглядаў наступным чынам: англійскай мовы – 41,1 %; нямецкай мовы – 50,9 %; французскай мовы – 56,2 %; іспанскай мовы – 25 %, перакладчыцкі факультэт – 33,0 %. Па кафедрах грамадскіх навук адпаведна: гісторыі КПСС – 58,3 %; філасофіі – 71,4 %; палітэканоміі – 62,5 %, навуковага камунізму – 50,0 % [6, арк. 71, 72, 93, 94].

Шмат сіл Н.Г. Краснова укладвала ў арганізацыю навукова-даследчай работы, рупілася аб павышэнні прафесійнага ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ, пры гэтым вялікую ўвагу надавала падрыхтоўцы кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Рэктарат пастаянна трымаў пад кантролем пытанне аб адкрыцці ў інстытуце Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый. Адкрытая ў 1962 г. аспірантура паспяхова рыхтавала кадры вышэйшай кваліфікацыі, аднак адсутнасць у інстытуце Савета па іх абароне аж да 1972 г. стрымлівала навуковыя памкненні маладых вучоных. На той час у рэспубліцы быў адзіны Савет па абароне дысертацый па раманскіх і германскіх мовах у БДУ [7, арк. 107].

Між тым, у 1971 г. супрацоўнікі інстытута абаранілі 1 доктарскую і 8 кандыдацкіх работ, у тым ліку: Л.М. Скрэліна – доктарская дысертацыя па раманскіх мовах: кандыдацкія дысертацыі па германскіх і раманскіх мовах абаранілі А.І. Букаеў, Л.А. Сухарава, І.І. Панова, Я.М. Воўшын, Л.І. Апатава, В.А. Сцяпанаў; П.В. Дзядзюля – па гістарычных навуках [7, арк. 105]. Гэта дазволіла павысіць адносныя паказчыкі. На 1 студзеня 1971 г. сярод 605 штатных выкладчыкаў дактароў было толькі 3 (0,5 %), кандыдатаў навук і дацэнтаў – 102 (17 %), без вучоных ступеняў і званняў – 500 (82,6 %). У 1970/1971 навучальным годзе студэнцкай навукай займаліся 784 студэнты [7, арк. 12, 84]. У наступным годзе пасля адкрыцця Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый у інстытуце было абаронена 20 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па германскіх і раманскіх мовах (2 доктарскія) [8, арк. 44]. Пры гэтым 1 доктарская і 3 кандыдацкіх дысертацыі былі абаронены на кафедры граматыкі і гісторыі нямецкай мовы, дзе працавалі 16 выкладчыкаў кафедры. Да таго ж, у тым жа годзе 1 доктарская і 6 кандыдацкіх дысертацыйных даследаванняў былі рэкамендаваны да абароны [9, арк. 1]. Была завершана падрыхтоўка доктарскага дысертацыйнага даследавання дацэнтам кафедры агульнага мовазнаўства і літаратуры В.І. Тур [10, арк. 138], абаранілі 2 кандыдацкія дысертацыі на кафедры гісторыі КПСС – выкладчык А.А. Віхраў і старшы выкладчык Э.А. Ліпецкі [11, арк. 3] і інш.

Разгляд статыстычных даных, выяўленых сярод архіўных крыніц аб навукова-даследчай дзейнасці калектыву інстытута, пераконвае ў тым, што за гады рэктарства Н.Г. Красновай не толькі склалася, але і замацавалася станоўчая тэндэнцыя павелічэння колькасці абароненых дысертацый і колькасці студэнцкіх навуковых работ. Гэтаму садзейнічалі метады самастойнай работы аспірантаў у ходзе падрыхтоўкі і завяршэння дысертацыйных даследаванняў, а таксама багаты вопыт дзейнасці вучоных МДПІЗМ на падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. У другой палове 1970-х гг. адносны працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі вырас. Адносны паказчык колькасці дактароў і прафесараў вырас з 0,8 у 1975 г. да 1,5 – у 1980 г.; кандыдатаў навук з 23,1 да 34,5 %. У 1975 г. студэнты інстытута за удзел у рэспубліканскім туры конкурсу (улік работ толькі І катэгорыі) атрымалі 58 грамат, тады як у 1979 г. – 91 [12, арк. 67–68 ].

У кастрычніку 1974 г. у інстытуце адкрываецца навукова-даследчая лабараторыя «Актыўныя метады навучання замежным мовам у ВНУ і школе», якая вырашала наступныя задачы: а) укараненне ў практыку найбольш эфектыўных метадаў навучання; б) правядзенне тэарэтычных даследаванняў і эксперыментальнай праверкі новых, актыўных метадаў навучання; в) удасканальванне навукова-метадычнай падрыхтоўкі прафесарска-выкладчыцкага складу інстытута; г) прыцягненне да навукова-даследчай работы выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама настаўнікаў замежных моў гарадскіх і сельскіх школ; д) вядзенне сістэматычнай прапаганды

актыўных і новых метадаў навучання замежным мовам у ВНУ і школах рэспублікі. Гэту работу вялі секцыі па паскораным, праблемным і дыферэнцыраваным вывучэнні замежных моў. Кіраўніцтва лабараторыяй ажыццяўляў савет на чале з дацэнтам І.Ф. Камковым [13, арк. 28–29].

Цэлы комплекс мерапрыемстваў, праведзены вучонымі інстытута ў розных сферах лінгвістычнай навукі, уключаючы даследаванні на стыку навук, даў свой станоўчы вынік. Так, у 1990 г. аспірантуру інстытута закончылі 27 чалавек, з якіх 12 прадставілі завершаныя работы ў спецыялізаваны савет па абароне. Абаранілі дысертацыі падчас знаходжання ў аспірантуры 4 чалавекі. З выкладчыкаў інстытута навучаліся 5 чалавек, 4 з якіх закончылі аспірантуру з прадстаўленнем дысертацыі да абароны. Значна вырас навуковы патэнцыял інстытута ў 1989 г., калі на працягу года былі абаронены 3 доктарскіх (А.А. Метлюк, М.В. Шарамета, М.І. Лешчанка) і 15 кандыдацкіх дысертацый [14, арк. 110; 15, арк. 5]. У канцы 1980-х гг. у інстытуце працавалі 10 дактароў і прафесараў, 239 кандыдатаў і дацэнтаў, ці 43,0 % ад штатнага раскладу ППС. Найбольш поўна былі ўкамплектаваны кадрамі вышэйшай кваліфікацыі кафедры граматыкі і гісторыі французскай мовы, а таксама тэорыі, эксперыментальнай фанетыкі і стылістыкі англійскай мовы. Ніжэй сярэдняга паказчыка мели 14 з 34 кафедраў інстытута [15, арк. 5–6]. За 1990 г. было абаронена 24 дысертацыі, з іх 7 – выкладчыкамі інстытута [16, арк. 5].

Дзякуючы асабістаму клопату рэктарата, у адукацыйным працэсе ўпершыню пачынае выкарыстоўвацца камп’ютарная тэхніка. У адпаведнасці з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР, у 1975 г. у інстытуце з мэтай паляпшэння арганізацыі і правядзення вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы адкрылася кафедра структурнай і прыкладной лінгвістыкі [17, арк. 144].

У 1970/1971 навучальным годзе ў інстытуце згодна з пастановай ЦК КПСС і СМ СССР ад 20 жніўня 1969 г. «Аб арганізацыі падрыхтоўчых аддзяленняў пры вышэйшых навучальных установах» адкрываецца падрыхтоўчае аддзяленне, дзе на дзённай форме займаліся 75 слухачоў і 25 – навучаліся без адрыву ад вытворчасці [17, арк. 15]. Аддзяленне рыхтавала слухачоў для паступлення на адзін з 4 факультэтаў: англійскай, французскай, нямецкай і іспанскай моў. Уся работа на аддзяленні была накіравана на падрыхтоўку слухачоў з рабочых, калгаснікаў і дэмабілізаваных з радоў Савецкай Арміі. Так, сярод залічаных на аддзяленне, 18 слухачоў былі з сельскай мясцовасці, 31 – дэмабілізаваны і 51 – з рабочых. Сярод слухачоў дзённага аддзялення 12 былі членамі і кандыдатамі ў члены КПСС. Выпускныя экзамены паказалі, што большасць слухачоў добра справіліся з вучэбнымі праграмамі, ¾ слухачоў паказалі добрыя і выдатныя веды, здавальняючыя ацэнкі атрымалі толькі 25 % слухачоў [17, арк. 15–20].

Аналіз колькасных зменаў кантынгенту студэнтаў у 70-х гг. паказвае, што інстытут па колькасці студэнтаў вырас амаль у 1,6 разоў у параўнанні з 1970 годам, пры гэтым у 2 разы – па дзённай форме навучання. Колькасць студэнтаў у 1978/1979 навучальным годзе дасягнула лічбы ў 3332 чалавекі,

пры гэтым на дзённым аддзяленні займалася 2966 чалавек. Параўнаўчы аналіз даных сведчыць, што ў 60-х гг. колькасць студэнтаў вырасла больш чым у 3 разы, а па стацыянары – больш чым у 3,6 раза. У 70-х гг. працягвалася даволі істотнае павелічэнне колькасці студэнтаў, галоўным чынам за кошт шырокага прыёму першакурснікаў і ўвядзення вячэрняга аддзялення [5, арк. 3; 18, арк. 105]. Уяўляе інтарэс аналіз сацыяльнага становішча студэнцкага кантынгенту інстытута. Так, у пачатку 80-х гг. на дзённай форме на факультэтах англійскай, французскай, нямецкай і іспанскай моў навучаліся 2525 студэнтаў, сярод якіх з сямей рабочых – 1071 студэнт, калгаснікаў – 325, служачых – 1129; па нацыянальным складзе карціна выглядала наступным чынам: беларусаў – 1565, рускіх – 733, палякаў – 111, украінцаў – 83, яўрэяў – 18, татар – 4, латышоў – 3, чувашоў – 2, грэкаў, венграў, балгараў і іспанцаў – па адным, іншых – 115 студэнтаў [19, арк. 4].

З мэтай падрыхтоўкі ваенных перакладчыкаў у сярэдзіне 70-х гадоў у інстытуце адкрываецца ваенная кафедра, якую адрознівала ад падобных структур у іншых ВНУ краіны тое, што ўсе выкладчыкі валодалі замежнымі мовамі. Спатрэбілася зусім няшмат часу для таго, каб кафедра заняла сваё пачэснае месца ў вучэбнай і выхаваўчай падрыхтоўцы студэнтаў інстытута [4, с. 87].

Аб павелічэнні колькасці студэнтаў ў пэўным сэнсе сведчыць і адкрыццё ў інстытуце падрыхтоўчага аддзялення для замежных грамадзян, створанага на базе МДПІЗМ у адпаведнасці з загадам Міністэрства вышэйшых навучальных устаноў БССР № 512 ад 12 кастрычніка 1979 г. У першы навучальны год слухачамі аддзялення былі залічаны студэнты з 11 краін свету (51 чалавек), у тым ліку з: Амана, Ганы, Гвінеі-Бісаў, Іарданіі, Ірака, Йеменскай Арабскай Рэспублікі, Кеніі, Малі, Лівана, Сенегала, Сірыі. Абавязкі загадчыка падрыхтоўчага аддзялення былі ўскладзены на У.І. Базарава. Замежныя слухачы размяшчаліся ў інтэрнаце № 1 па завулку Омскі, 12 [10, арк. 30–31].

У 1980/1981 навучальным годзе на падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян былі залічаны 109 студэнтаў, з якімі працавалі 23 выкладчыкі кафедры, у тым ліку загадчык кафедры рускай мовы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт М.П. Кавалёў. Вучэбна-метадычную работу праводзілі дзве метадычныя секцыі: першая была скіравана на фарміраванне ў студэнтаў моўных навыкаў і ўменняў работы з лексіка-граматычнымі матэрыяламі; другая – на фарміраванне моўных навыкаў і ўменняў на матэрыяле па гісторыі СССР, рускай і савецкай літаратуры, эканамічнай геаграфіі [20, арк. 60].

1980-ы год у гісторыі інстытута быў адзначаны тым, што ў сувязі з падрыхтоўкай летніх Алімпійскіх гульняў у Маскве загадам рэктара ў інстытуце быў створаны Алімпійскі штаб. Мэтай яго з'яўлялася паляпшэнне падрыхтоўкі гідаў-перакладчыкаў. Штаб узначаліў прарэктар па вучэбнай рабоце М.А. Хазяеў. Пры штабе створаны секцыі, у тым ліку: арганізацыйная ў складзе 9 чалавек; лекцыйна-прапагандысцкая ў складзе 6 чалавек; метадычная – у складзе 7 чалавек [21, арк. 3–4].

У цэнтры ўвагі кіраўніцтва і грамадскіх арганізацый інстытута пастаянна знаходзіліся пытанні арганізацыі і правядзення комплекснай выхаваўчай работы, накіраванай на фарміраванне навуковага светапогляду, на героіка-патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі. Якраз у гэтай сферы найбольш яскрава праявіўся арганізацыйны талент Н.Г. Красновай. У інстытуце ствараюцца ўніверсітэты культуры і прававых ведаў, клубы выхаднога дня і інтэрнацыянальнай дружбы, праводзяцца цыклы лекцый, сустрэчы, размовы за круглым сталом, вядуцца вусныя журналы і ладзяцца завочныя вандроўкі ў краіны вывучаемай мовы, сустрэчы з цікавым людзьмі, выпускнікамі інстытута, арганізоўваюцца экскурсіі за межы рэспублікі, турыстычныя паходы, эстафеты, дні паэзіі і шмат іншага.

Актыўна працаваў факультэт грамадскіх прафесій, дзе заняткі вяліся на 3 аддзяленнях: а) грамадска-палітычным; б) псіхолага-педагагічным; в) мастацкім. У 1980/1981 навучальным годзе на факультэце з агульнай колькасці 2525 студэнтаў на дзённай форме навучаліся 1804, у тым ліку: 461 – на грамадска-палітычным аддзяленні; 995 – на псіхолага-педагагічным і 348 – на мастацкім. Заняткі праводзіліся па 17 спецыяльнасцях. Рыхтаваліся лектары, прапагандысты, рэферэнты па праблемах міжнароднага руху, палітычныя каментатары (лектары-міжнароднікі), журналісты, фотакарэспандэнты, рэжысёры, харэографы, дырыжоры, інструктары па спорце, спецыялісты па бальных танцах і г.д. [22, арк. 84]. У працоўным семестры 1981 г. у інстытуце было створана 11 будаўнічых атрадаў, якія працавалі ў Цюменскай вобласці, Малдаўскай ССР, Карэліі і ў Беларусі з удзелам 354 студэнтаў [22, арк. 83].

Інстытут праводзіў шэфства над сельскімі школамі, кожны факультэт быў замацаваны за цэлай вобласцю, дзе праводзіў шэраг мерапрыемстваў не толькі сярод сельскіх школьнікаў, але і сярод настаўнікаў з мэтай правядзення іх удасканалення і перападрыхтоўкі па месцы пражывання. Работу вялі ў розных часцях Савецкай арміі, сярод салдат напярэдадні дэмабілізацыі, для таго, каб зацікавіць іх да паступлення ў інстытут. З мэтай патрыятычнага выхавання праводзіліся экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, сустрэчы з ветэранамі вайны і партызанскага руху ў Беларусі. З 1973 г. праводзілася агульнаінстытуцкая гульня «Баграціён». У Дзень Перамогі падводзілі вынікі патрыятычнага выхавання ў пасёлку Гатава Мінскага раёна. Там інстытут сумесна з мінскім заводам «Імя Кастрычніцкай рэвалюцыі» ўдзельнічаў у пабудове помніка загінуўшым воінам, якія былі пахаваны ў брацкай магіле, быў пасаджаны парк [4, с. 89].

У пераліку падзей, да якіх мела непасрэднае дачыненне рэктар інстытута, трэба адзначыць 25-годдзе стварэння інстытута. З гэтай нагоды ў інстытуце адкрыўся музей. Пры ім працавала група студэнтаў старшых курсаў, якія штогод праводзілі экскурсіі для першакурснікаў, гасцей, прадстаўнікоў замежных дэлегацый. Як вынік, кожны студэнт быў добра знаёмы з гісторыяй педагагічнай установы [4, с. 90]. З нагоды святкавання такой даты ў пачатку кастрычніка 1973 г. было праведзена ўрачыстае

пасяджэнне Савета інстытута з удзелам каля 800 чалавек, у тым ліку прадстаўнікоў іншых навучальных устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый г. Мінска і рэспублікі. З уступным словам выступіла рэктар інстытута Н.Г. Краснова, потым былі агучаны звыш 20 прывітальных слоў ад грамадскіх арганізацый і ВНУ рэспублікі, уручаны вітальныя адрасы і памятныя падарункі. Пасля заключнага слова рэктара быў прадэманстраваны кінафільм «Заўсёды ў пошуку» [23, арк. 12–14].

Такім чынам, чарговыя два дзесяцігоддзі гісторыі МДПІЗМ, разгледжаныя на аснове дакументальных крыніц і фактычных звестак з успамінаў Н.Г. Красновай аб рабоце на пасадзе рэктара інстытута, пераконваюць у тым, што развіццё профільнай ВНУ было плённым і паспяховым, нягледзячы на абставіны, якія існавалі ў эпоху пабудовы развітога сацыялізму і да якіх дабавіліся новыя, узнікшыя ў другой палове 1980-х гг. гадоў у сувязі з пачаткам перабудовы і спробамі мадэрнізацыі савецкай сістэмы, у тым ліку вышэйшай адукацыі. Надаючы асаблівую ўвагу пытанням удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэння якасці падрыхтоўкі настаўнікаў замежных моў на аснове ўкаранення сучасных метадаў і прыёмаў навучання, а таксама праз шырокае выкарыстанне традыцыйнага вопыту і інавацыйных падыходаў за той час была выпушчана не адна тысяча выпускнікоў інстытута, якія плённа працавалі і працуюць на педагагічнай ніве ў школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах рэспублікі, з'яўляюцца вядучымі спецыялістамі ў розных сферах дзейнасці і годна прадстаўляюць суверэнную Беларусь за яе межамі і ў пачатку XXI стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1. Личное дело Красновой Нины Георгиевны // Архіў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта (МДЛУ). – Воп. 5. – Спр. 219.

2. *Новікаў С.Я.* Краснова Ніна Георгіеўна (да юбілею) / С.Я. Новікаў // Вестник МГЛУ. Сер. 3. История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2008. – № 7.

3. Отчет о работе МГПИИЯ в 1980–1981 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1036.

4. *Краснова Н.Г.* Страницы моей жизни / Н.Г. Краснова. – Минск : Издат. центр БГУ, 2012. – 95 с.

5. Предложения к основным направлениям подготовки специалистов с высшим образованием – учителей иностранных языков на 1976–1990 годы от 25 декабря 1972 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 584.

6. Отчет о работе МГПИИЯ в 1979–1980 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 984.

7. Приказы и инструктивные письма Минвуза СССР и БССР за 1975 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 536.

8. Итоги выполнения социалистических обязательств в МГПИИЯ за 1973 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 670.
9. Отчет кафедры грамматики и истории немецкого языка о НИР в 1973 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 643в.
10. Отчет кафедры общего языкознания и литературы МГПИИЯ о НИР в 1973 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 643б.
11. Отчет кафедры истории КПСС МГПИИЯ о НИР в 1973 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 643а.
12. Отчет МГПИИЯ о научно-исследовательской работе в 1980 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 994.
13. Протоколы заседаний ректората и документы к нему. Т. 1 (сентябрь 1974–май 1975 г.) // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 713.
14. Протоколы заседаний совета института и документы к ним за 1989–1990 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1574.
15. Отчеты института и кафедр о научно-исследовательской работе за 1989 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1567.
16. Отчет МГПИИЯ о научно-исследовательской работе в 1980 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1632.
17. Отчет о работе МГПИИЯ в 1970–1971 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 528.
18. Протоколы заседаний совета факультета французского языка с 19.9.1973 по 26.7.1974 гг. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1036.
19. Статистические отчеты института о количественном составе сотрудников и студентов (дневное отделение) МГПИИЯ по состоянию на 1.10.1980 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1045.
20. Отчет кафедры русского языка подготовительного факультета для иностранных граждан МГПИИЯ за 1980–1981 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1039.
21. Приказы ректора института по основной деятельности с 3.3.1979 по 19.9.1979 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 909.
22. Отчет о работе МГПИИЯ в 1980–1981 учебном году // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 1036.
23. Протоколы заседаний совета института и документы к ним за 1973–1974 учебный год // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 1. – Спр. 669.